**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна**
**за верасень 2020 г.**

**<u>Мерапрыемствы ў рамках раённага рэкламнага тыдня «Пошук уласнага іміджу»</u>**

У бібліятэках ДУК прйшоў раённы рэкламны тыдзень «Пошук уласнага іміджу», у рамках якога шэраг бібліятэк ДУК правялі дні адчыненых дзвярэй, дабрачынныя акцыі, дні бібліятэкі ў школе, інфармацыйна-рэкламныя гадзіны, дні чытацкага самакіравання, экскурсіі, дні чытацкіх задавальненняў, дублёр-шоу, урокі-гульні, арганізавалі выставы.

Акцыя «BOOKface-челлендж» прайшла ў групе «Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка» ў сацыяльных сетках «Одноклассники», «ВКонтакте», «Фейсбук». У Інтэрнеце размяшчаліся фотаздымкі бібліятэкараў і чытачоў, на якіх твар мадэлі сумяшчаўся з вокладкай кнігі.

*ЦБ*

**17 верасня**

Дзень адчыненых дзвярэй «Чтоб шагалось в ногу с веком, приходи в библиотеку» ў Гарадзецкім філіяле склаўся з экскурсіі «Для юных книгочеев наш дом открыт всегда», дабрачыннай акцыі «Книга – в подарок библиотеке», віртуальнага падарожжа па самым незвычайным бібліятэкам, падвядзення вынікаў конкурса летняга чытання.

*Гарадзецкі ф-л, 27 чал.*

**18 верасня**

На свята кнігі і чытача «Остров книголюбов» у бібліятэку прыйшлі вучні Тэвельскага дзіцячага сада-пачатковай школы. Яны даведаліся пра цікавыя факты з гісторыі бібліятэк і кніг, пазнаёміліся з прафесіяй бібліятэкара, здзейснілі падарожжа на востраў кнігалюбаў, пераадолеўшы «Залив Стихов», «Реку Приключений», «Поле Рассказов», «Гору Сказок». Дапамагала ім Кніжная Фея, а Ліса Аліса і Кот Базіліа блыталі рабят падступнымі пытаннямі. Выклікала цікаўнасць кніжная выстава «Чудо, имя которому – книга».

*Тэвельская ПБ, 25 чал.*

**<u>Іншыя мерапрыемствы</u>**

**4 верасня**

Дзень беларускага пісьменства ў Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы адзначылі паэтычнай гадзінай «Вершапад па-беларуску». Гасцямі і ўдзельнікамі мерапрыемства сталі дзевяцікласнікі гімназіі г. Кобрына. Пасля знаёмства з гісторыяй свята ўсе прысутныя гулялі ў паэтычнае лато «Вершапад па-беларуску», чытаючы вершы беларускіх паэтаў на пэўныя тэмы. Да гульні далучыліся і дзве кобрынскія паэткі – члены літаратурнага клуба «ПоэтиКо» Марына Міхалюк і Наталля Кандрашук, якія прапанавалі ўвазе гледачоў асабістыя творы.

*ЦБ, 32 чал.*

**6 верасня**

У Паляцічскай бібліятэцы юныя чытачы падчас пазнавальна-гульнявой праграмы «Правила дорожные детям знать положено» чыталі вершы, дзяліліся ўражаннямі аб прачытаных кнігах, удзельнічалі ў конкурсах «Весёлый светофор», «Дорожный калейдоскоп», «Островок художника», гулялі ў настольныя і рухавыя гульні на свежым паветры.

*Паляцічская ПБ, 18 чал.*

**18 верасня**

На пасяджэнні клуба вясёлых і начытаных «Всезнайка» ў Акцябрскай бібліятэцы дзеці здзейснілі падарожжа-гульню «Кто в лесу живет, что в лесу растет».

*Акцябрская ПБ, 12 чал.*

**20 верасня**

Вераснёўскае пасяджэнне літаратурнага клуба «ПоэтиКо» ў Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшло ў фармаце паэтычнага компаса «Удивительный мир поэзии». Замест старон свету былі метафары і вершаваныя памеры. Паэты падбіралі метафары да дадзеных слоў і дзяліліся сваёй творчасцю, у тым ліку вершамі, напісанымі ў якасці дамашняга задання. Асобным блокам стала прэзентацыя зборніка вершаў «Созвучье слов живых», выдадзенага аддзелам бібліятэчнага маркетынгу па матэрыялах конкурса духоўнай паэзіі, і ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу.

*ЦБ, 9 чал.*

## <u>Выдавецкая дзейнасць</u>

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу выдадзены зборнік вершаў «Созвучье слов живых» – па выніках кокурсу духоўнай паэзіі «Есть сила благодатная в созвучье слов живых», прымеркаванага да 500-годдзя Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра. Кніга склалася з лепшых вершаў канкурсантаў і двух членаў журы, усяго 15 паэтаў з Кобрыншчыны, Брэста, Слоніма і Масквы.

*ЦБ*

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу перавыданы даведнік «Нацыянальная літаратурная прэмія». У выданні сабрана інфармацыя аб Нацыянальнай літаратурнай прэміі, якой узнагароджваюць аўтараў лепшых кніг у Рэспубліцы Беларусь. У абноўлены варыянт дададзены пераможцы галоўнага літаратурнага конкурса краіны 2020 года.

*ЦБ*

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу выдадзены зборнік сцэнарных матэрыялаў грамадзянска-прававой тэматыкі «Гражданином быть обязан». Пры складанні зборніка выкарыстаны сцэнарыі з часопіса «Бібліятэка прапануе», Інтэрнэта і аўтарскія распрацоўкі галоўнага бібліёграфа аддзела абслугоўвання і інфармацыі С. Д. Курачук.

*ЦБ*

Ефціфеева Н. П.
8-01642-3-85-81